УДК 378.017.4:82

Н. Я. Савіцкая, ст. выкладчык

# ЛІТАРАТУРНЫ КЛУБ ЯК АДНА З ФОРМ ІДЭАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

The article considers the problems of ideological education of youth in the modern period of society development. The structure, aims, forms and functions of ideology are determined; the activity of literary circle of BSTU «Vetlitsa» in the light of ideology of our state is elucidated; the particular attention is paid to social and cultural activity since it is the universal way of non-violent personality development. Besides, the attention is drawn to student socialization.

**Уводзіны.** Выхаванне грамадзяніна ў нашай краіне на сучасным этапе яе развіцця звязана з ідэалогіяй, якая ўплывае на працэс фарміравання асобы.

Змены ў палітыцы, эканоміцы і сацыякультурным асяроддзі грамадства ў пачатку XXI ст. у Беларусі адлюстраваліся на каштоўнасных арыентацыях, нормах і правілах паводзін дзяцей і моладзі. У гэтых умовах пытанні ідэалагічнай працы сталі стрыжнёвай функцыяй працэсу выхавання, якая забяспечвае фарміраванне ідэйна-палітычных, маральных і грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы.

**Асноўная частка.** Выхаванне не можа ажыццяўляцца без апоры на тыя ці іншыя ідэі, ідэалы, светапоглядныя ўстаноўкі, погляды, у змесце якіх сёння пераважае беларуская дзяржаўнасць, а ядром ідэалогіі з'яўляюцца ідэі росквіту і абароны Айчыны, маральнага, грамадзянска-патрыятычнага і валеалагічнага выхавання моладзі [1]. Айчынны досвед і даследаванні заходніх аналітыкаў паказалі, што ідэалогія з'яўляецца неад'емнай часткай сацыяльнай рэчаіснасці, палітычнага і духоўнага быцця сучаснага грамадства, спецыфічнай арыентацыйна-каштоўнаснай свядомасцю, якая выражае інтарэсы розных сацыяльных груп і грамадства ў цэлым [2].

Ідэалогія вызначае *мэты* палітыкі, фарміруе арыенціры палітычнай дзейнасці, абгрунтоўвае выбар сродкаў яе рэалізацыі, арганізуе намаганні зацікаўленых людзей у ажыццяўленні палітыкі, г. зн. ідэалогія выконвае такія сацыяльныя *функцыі,* як светапоглядна-арыентавальная, пазнавальная, аксіялагічная, нарматыўна-рэгулятыўная, матывацыйна-прагматычная, выхаваўчая, камунікатыўная, сацыяльна-пераўтваральная.

*Формамі* ідэалогіі з'яўляюцца палітычная, эканамічная, прававая, маральная, мастацка-эстэтычная, экалагічная і інш. У *структуру* ідэалогіі ўключаюцца такія кампаненты, як веды, ідэі, погляды, каштоўнасці, нарматывы, перакананні, дзеянні, валявы кампанент, інтарэсы, мэты, ідэалы, воля да дзеяння.

Выражаныя ў лагічна, дакладна пабудаваным выглядзе, з рацыянальна строгімі вывадамі і тэарэтычнымі пабудовамі, ідэі маладаступныя шырокаму колу людзей [3].

Таму яшчэ вельмі важны і эмацыянальны, пачуццёвы, масава-псіхалагічны ўзровень функцыянавання і праяўлення ідэалогіі, які можа канкрэтызавацца ў дзейнасці клубаў па інтарэсах, правядзенні канкрэтных мерапрыемстваў, акцый і інш.

Вядома, што каштоўнасныя сістэмы фарміруюцца ў гістарычным развіцці грамадства. Яны генетычна не перадаюцца па спадчыне, а засвойваюцца ў працэсе сацыялізацыі чалавека. Адной з такіх форм сацыялізацыі з'яўляецца творчая дзейнасць студэнтаў у літаратурным клубе «Ветліца», якая рэалізуецца праз напісанне ўласных твораў, выступленне з імі перад аўдыторыяй, удзел у конкурсах, вечарынах, сустрэчах з пісьменнікамі, ветэранамі вайны, праз працы, публікацыю твораў у друку і інш.

Літаратурны клуб «Ветліца» працуе ў БДТУ на базе кафедры беларускай мовы з 1997 г. Дзесяцігадовы вопыт дзейнасці клуба дазваляе зрабіць пэўныя падагульненні, дае магчымасць падзяліцца здабыткамі гэтай працы.

Літаратурны клуб арганізаваны з мэтай развіцця творчай актыўнасці студэнтаў, фарміравання высокамаральнай, усебакова развітай асобы, гатовай дзейнічаць у інтарэсах народа і дзяржавы.

Асноўнай задачай літаратурнага клуба з'яўляецца выкарыстанне творчага патэнцыялу студэнцтва ў ідэалагічнай і выхаваўчай працы кафедры і універсітэта.

Палажэнне аб літаратурным клубе «Ветліца» распрацавана на аснове палажэння аб навукова-даследчай працы студэнтаў вузаў і шэрага дакументаў аб арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай працы.

Літаратурны клуб – гэта від творчай дзейнасці па інтарэсах, ў сваёй працы ён можа выкарыстоўваць і спалучаць шматлікія формы дзейнаці, напрыклад: выступленні перад вялікай і малой аўдыторыяй, удзел у літаратурных конкурсах, вечарынах, выпуск насценных літаратурных газет, літаратурных альманахаў, камп'ютэрных варыянтаў уласных збораў твораў, сустрэчы з пісьменнікамі, літаратурнымі суполкамі, аб'яднаннямі і інш.

Творчасць – гэта паказчык індывідульнага свету асобы. Вельмі важна для многіх, асабліва маладых людзей, пераадолець сябе і адкрыцца

перад усімі, паколькі, на думку вучоных, сярод беларусаў больш інтравертаў, г. зн. людзей, якія заглыблены ў свой унутраны свет і часта з'яўляюцца пасіўнымі ў адносінах да знешніх падзей. Вядома, што многія маладыя людзі, асабліва на першых курсах, з цяжкасцю адаптуюцца да новага асяроддзя, адчуваюць сябе няўпэўнена, адчуджана. Выступленні перад аўдыторыяй (на пасяджэннях літаратурнага клуба, у кураторскіх групах, на сустрэчах з пісьменнікамі, літаратурных вечарынах) выхоўваюць у асобы ўпэўненасць у сабе, вучаць уменню перадольваць страх, не баяцца аўдыторыі, смела, прыгожа і правільна выказваць свае думкі і г. д. Аўдыторыя, як правіла, слухае зацікаўлена, паколькі ў паэтычнай форме выказваюць свае думкі і пачуцці блізкія па ўзросце людзі, аднакурснікі, сябры, калегі. Успрымаючы і ацэньваючы асобу, аўдыторыя бачыць шмат цікавага, адчувае сугучнасць многім уласным тэмам і перажыванням, а ў нечым – непадобнасць, іншыя погляд і бачанне звычайнага, паўсядзённага. Гэта дазваляе глыбей пазнаць свет і самога сябе, упэўніцца, што побач з табой жывуць непадобныя, але цікавыя людзі. Песімістычна настроеныя бачаць, што яны не адзінокія ў сваім песімізме, што ў ім няма арыгінальнасці, што яго можна пераадолець.

Літаратура, паэзія – гэта высокія словы, вытанчаныя пачуцці, вобразы. Пошук патрэбнага слова, стварэнне вобраза развівае маўленчыя навыкі, вучыць даносіць думкі да аўдыторыі. Прэзентуючы свае лепшыя творы, аўтары развіваюць у аўдыторыі пачуццё прыгожага, гарманізуюць асобу.

Лепшыя творы членаў клуба друкуюцца ў літаратурна-мастацкім альманаху «AVE», назву якога можна разглядаць як абрэвіятуру – «Адраджэнне. Вера. Еднасць». За дзесяць гадоў дзейнасці клуба выдадзена 5 нумароў.

Мэта выдання – markнабакова паказаць наш час і нас у гэтым часе, аб'яднаных месцам працы і навучання – нашым універсітэтам. У творах аўтараў альманаха адлюстраваны іх думкі і пачуцці, жыццёвае крэда і мары.

Варта адзначыць, што сярод мноства канструктыўных ідэй, прапанаваных у постсавецкі час для кансалідацыі грамадства, ідэя патрыятызму займае адно з вядучых месцаў. Выхаванне патрыятызму на гераічных прыкладах з гісторыі Беларусі з'яўляецца адной з найважнейшых сфер духоўнага жыцця. Патрыятызм – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, выпрацаваных і замацаваных у народзе стагоддзямі. Ён выяўляецца ў палітычнай культуры, у спробе дачынення людзей да гістарычнага лёсу Бацькаўшчыны, у імкненні развіваць нацыянальную культуру і прымнажаць нацыянальныя традыцыі. Асноўныя рысы патрыятызму нашага сучасніка – адданасць інтарэсам свайго народа, ідэалам суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці, гатоўнасць унесці свой пасільны ўклад у станаўленне і мацаванне маладой дзяржавы.

У свядомасці сучаснага грамадзяніна ствараецца вобраз Айчыны як цывілізаванай, суверэннай маладой дзяржавы са старажытнымі традыцыямі, якія, акумулюючы вопыт мінулага, з'яўляюцца культурнагенетычным кодам народа, захоўваючы «рысы вечнасці», існуючы насуперак пераменліваму часу.

Радуе тое, што моладзь свята шануе памяць аб гістарычным мінулым нашай краіны. Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне і яго асэнсаванне – скразная тэма альманахаў.

У пяці альманахах змясцілі творы пра вайну 62 аўтары. Гэта ветэраны вайны, прафесары – Новікаў Г. І., Анціпаў В., Кулажанка У. А., якія пісалі або расказвалі моладзі аб непасрэдным удзеле ў ваенных падзеях, больш маладыя аўтары – дацэнт Жлобіч А. В., старшы навуковы супрацоўнік Капсараў А. Р., ветэран працы Гаўрош М. М., а таксама студэнты, якія ведаюць вайну па расказах сваіх бабуль, праз сустрэчы з ветэранамі, праз кнігі і кінафільмы. Усе яны пакінулі свае ўражанні, думкі і пачуцці на старонках зборнікаў.

Зараз аб'яўлены Прэзідэнцкі конкурс на лепшую творчую працу, прысвечаную 65-годдзю вызвалення Беларусі, і шэсць членаў клуба падалі заяўку на ўдзел у конкурсе, дзесяць – на ўдзел у студэнцкай літаратурнай канферэнцыі, прысвечанай гэтай даце.

Працу літаратурнага клуба можна разглядаць праз прызму сацыяльна-культурнай дзейнасці – універсальнага спосабу ненасільнага развіцця асобы. Гэта творчы педагагічны падыход дазваляе праявіцца таленту, уплывае на фарміраванне светапогляду асобы. Светапогляд нельга навязаць, ён фарміруецца толькі ва ўмовах свабоднага развіцця асобы, якая ўспрымае навакольны свет – прыроду, сацыяльныя адносіны – як адзінае цэлае. Асоба – гэта чалавек, які валодае пэўным светпоглядам, здольны зрабіць асэнсаваны выбар. Асобай чалавек становіцца ў працэсе сацыялізацыі.

Сацыялізацыя – гэта працэс прысваення індывідам сацыяльнага вопыту, які азначае ўключанасць асобы ў сістэму грамадскіх адносін і сістэму роляў, правоў і абавязкаў грамадзяніна сваёй Айчыны [4].

Ва ўмовах ненасільнага выхавання сацыяльна-культурная дзейнасць становіцца адным з найбольш эфектыўных метадаў працы не толькі з моладдзю, але і з дарослымі. Можна сказаць, што клуб аб'ядноўвае вельмі розных па ўзросце асоб. Гэта, перш за ўсё, студэнты 1–5-х курсаў, выпускнікі, магістранты, аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі, іх дзеці і ўнукі. Сацыялізацыя маладых асоб адбываецца не толькі праз дзейнасць моладзі ў розных відах мерапрыемстваў,

гутаркі, сустрэчы, але і праз перадачу сацыяльнага вопыту людзей старэйшага пакалення, якія ў сваю чаргу, сустракаючыся з таленавітай моладдзю, атрымліваюць шмат станоўчых эмоцый. Адбываецца повязь пакаленняў, і кожная асоба, аддаючы часцінку сваёй душы людзям, аўдыторыі, грамадству, у той жа час, знаходзіць шмат для сябе новага, станоўчага, карыснага.

Можна сказаць, што сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта форма і змест ненасільнага ўваходжання чалавека перш за ўсё ў культуру свайго народа, спасціжэнне гэтай культуры, прысваенне і яе далейшае развіццё. Такая дзейнасць, у аснове якой ляжыць маральны фундамент, з’яўляецца механізмам захавання і развіцця багацейшай нацыянальнай культуры. Гэты працэс атрымаў назву інкультурацыі асобы. Канчатковы вынік інкультурацыі – інтэлігент. Інкультурацыя мае на мэце ўключнасць асобы ў актыўную культурнатворчую дзейнасць [5], якой і з'яўляецца праца ў літаратурным клубе.

Сучасныя ідэалагічныя прырытэты ўсё ў большай ступені павінны арыентавацца на агульначалавечыя каштоўнасці, ідэалы ненасілля, талерантнасці, узаемапавагі і ўзаемапрызнання, дыялога розных народаў і канфесій у імя забеспячэння цэласнасці сучаснага цывілізацыйнага развіцця чалавецтва і ідэалагічнай кансалідацыі грамадства.

Сацыякультурная дзейнасць уяўляе сабой адну з разнавіднасцей свабодна-нефармальнай дзейнасці, якая не вызначаецца (падобна працы, навучанню і г. д.) уплывам знешніх фактараў, а ажыццяўляецца як натуральная неабходнасць і волевыяўленне асобы.

Гэтая дзейнасць характарызуецца стварэннем пэўных каштоўнасцей (творчых праграм, святаў, канцэртаў, фестываляў і г. д.). Дадзены працэс стварэння і яго вынік задавальняюць патрэбнасці ў творчасці, зносінах, змястоўным правядзенні вольнага часу ўсіх яго ўдзельнікаў. У такім узаемадзеянні фарміруюцца як пэўныя асобасныя якасці, так і сацыяльна значымыя навыкі паводзін.

**Заключэнне.** Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што адукацыя сёння – гэта сацыяльны інстытут, грамадска-дзяржаўная сістэма, закліканая забяспечыць адукацыйныя запатрабаванні дзяржавы, грамадства і асобы. Менавіта ў гэтым сэнсе адукацыя і выхаванне носяць статус грамадзянскасці, выхаванне разглядаецца як вышэйшая ступень адукацыі, а далучэнне да дасягненняў нацыянальнай культуры – як магчымасць знаходжання агульных каштоўнасцей, згуртаванне розных сацыяльных груп.

Улічваючы featнабаковыя віды творчай дзейнасці, можна сказаць, што ў клубе адбываеццаператварэнне студэнта з яго арганічнымі схільнасцямі да свабоды, іншым разам з невыразнымі жаданнямі і самаацэнкамі ў асобу з упарадкаванай сістэмай грамадзянскіх, патрыятычных, маральных і эстэтычных поглядаў, здольную выкарыстоўваць грамадзянскія і маральныя пачуцці (пачуцці абавязку, патрыятызму, нацыянальнай годнасці і інш.), дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі перакананнямі і каштоўнаснымі ўстаноўкамі.

## Літаратура

1. Андрэеў, В. У. Прафесіяналізм педагога ў кантэксце ідэалогіі беларускай дзяржавы / В. У. Андрэеў, В. В. Макоска // Народная асвета. – 2005. – № 12. – С. 57–59.

2. Яскевич, Я. С. Становление идеологии белорусского государства и национальная идея: традиции и новации: учеб.-метод. пособие для высших учебных заведений / Я. С. Яскевич. – Минск: РИВШ, 2004. – С. 19.

3. Там жа. – С. 20.

4. Социальная педагогика. Проблема инкультурации личности / Под ред. В. Н. Наумчика. – Минск: Четыре четверти, 2007. – С. 208.

5. Педагогика ненасилия в социокультурной деятельности. – Минск: Четыре четверти, 2009. – С. 13.